Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 12(403) | Панядзелак, 4 красавіка 1960 года | Цана 10 кап.

*Да 90-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна*

# З ТРЫБУНЫ КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

У нядзелю 27 сакавіка адбылася XIV унечарговая камсамольская канферэнцыя універсітэта. З дакладам «Задачы камсамольскай арганізацыі універсітэта ў ажыццяўленні Закона аб перабудове вышэйшай асветы» выступіў намеснік рэктара па навучальнай частцы **А. Я. Малышаў.**

У дакладзе адзначалася, што камсамольская арганізацыя універсітэта пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі правяла пэўную работу па ажыццяўленню закона аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў краіне.

Тэматыка навукова-даследчых работ студэнтаў наблізілася да непасрэдных патрэб вытворчасці. Шэраг студэнтаў фізічнага і хімічнага факультэтаў выконваюць дыпломныя работы па заданиях прамысловых прадпрыемстваў горада Мінска.

Многа студэнтаў удзельнічае ў рабоце гурткоў пад кіраўніцтвам загадчыкаў кафедраў: прафесара Ерафеева (кафедра каталізу), дацэнта Фактаровіча (кафедра замежнай літаратуры), дацэнта Жыркевіча (кафедра беларускай мовы). Асабліва добра пастаўлена навукова-даследчая работа на біялагічным факультэце.

Пашыраюцца сувязі камсамольскай арганізацыі універсітэта з моладдзю прамысловых прадпрыемстваў і працаўнікамі вёскі. Студэнтамі універсітэта прачытана вялікая колькасць лекцый, праводзіліся выезды агітбрыгад.

Аднак, адзначае дакладчык, ёсць і істотныя недахопы ў рабоце арганізацыі. Галоўнае пытанне работы—пытанне вучобы—не стаяла ў цэнтры ўвагі камсамольскіх арганізацый некаторых факультэтаў, напрыклад, матэматычнага (сакратар т. Савельеў), фізічнага (сакратар т. Пятровіч). Аб гэтым сведчаць дрэнныя вынікі зімовай сесіі. 265 нездавальняючых адзнак, якія атрымалі фізікі і матэматыкі, гавораць самі за сябе.

У спрэчках па дакладу выступілі многія дэлегаты, якія ўзнімалі важныя пытанні камсамольскага жыцця. Сакратар партыйнай арганізацыі універсітэта т. **А. А. Волк** сказаў, што галоўным пытаннем з'ўляецца ўдзел моладзі ў працы. У нас жа атрымліваецца наадварот. Многія студэнты дрэнна працуюць на будаўніцтве галоўнага корпуса. Мы павінны выкрасліць такія факты з нашага жыцця.

Сакратар гаркома камсамола т. **Яршоў** адзначыў прынцыповасць рашэнняў важнейшых пытанняў на гэтай канферэнцыі, палічыўшы яе лепшай за папярэднія. Адначасова ён падкрэсліў, што студэнтам, якія прыйшлі ва універсітэт з вытворчасці, патрэбна дапамога з боку іх старэйшых таварышаў. Камітэт камсамола павінен прарабіць вялікую работу ў справе паляпшэння паспяховасці.

Многія дэлегаты выказалі думку, што студэнт гуманітарных факультэтаў павінен набыць якую-небудзь «грамадскую спецыяльнасць». Прыбыўшы на месца пра-

(Працяг на стар. 2).

**НЕКАЛЬКІ дзён назад група студэнтаў-першакурснікаў, якія пакуль што робяць першыя крокі ў галіне фотарэпартажа, пабывала на заводзе запасных частак. Узначальваў групу выкладчык фотасправы, работнік «Знамени юности» А. І. Мызнікаў.**

**Асабліва цікавымі былі сустрэчы з рабочымі ўчастка парашковай металургіі. Майстар цэха Уладзімір Грамовіч сардэчна сустрэў будучых журналістаў. У гасціннасці сапернічалі з ім былы студэнт Магілёўскага машына- будаўнічага тэхнікума Леанід Стражэвіч, дэмабілізаваныя воіны Барыслаў Урбан і Анатоль Баландзін.**

**Уменне гаварыць з людзьмі—галоўнае для журналіста. Але як завязаць знаёмства, весці гутарку? Людзі ж ёсць розныя. Адны не любяць блакнота і алоўка, другія не заўсёды падзеляцца з незнаёмым самым дарагім і блізкім. Уменне за пяць хвілін стаць блізкім для незнаёмага табе чалавекам—нялёгкая задача. Але, калі меркаваць па здымку, студэнты знайшлі шлях да сэрца рабочых. Б. Урбан, А. Баландзін, І. Кошман, А. Кукевіч, У. Грамовіч, А. Шлег размаўляюць ажыўлена, як сапраўдныя сябры.**



# 303.813.000 экземпляраў

**Агульны тыраж прац У. І. Леніна, выданых у нашай краіне з 1917 па 1959 год, складае 303 мільёны 813 тысяч экзэмпляраў, у тым ліку на рускай мове—229 мільёнаў 781 тысячу, на другіх мовах народаў СССР—57 мільёнаў 171 тысячу, на мовах народаў замежных краін — 16 мільёнаў 881 тысячу экзэмпляраў.**

**ПРАЦЫ У. І. ЛЕНІНА выдаюцца ў СССР на 88 мовах: на 62 мовах народаў СССР і на 26 мовах народаў замежных краін. Першыя пераклады твораў У. І. Леніна з рускай на мовы другіх народаў нашай краіны з'явіліся яшчэ да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Масавае выданне ленінскіх работ на ўсіх мовах народаў СССР пачалося пасля ўстанаўлення Савецкай улады. Ва ўсіх саюзных рэспубліках створаны інстытуты гісторыі партыі—філіялы Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС,—якія ажыццяўляюць пераклад і выданне на нацыянальных мовах твораў У. І. Леніна.**

**ТЫРАЖ КНІГІ У. І. ЛЕНІНА «Развіццё капіталізма ў Расіі» на 22 мовах складае 3 мільёны 383 тысячы экзэмпляраў, «Што рабіць?»—на 47 мовах 6 мільёнаў 625 тысяч, «Крок уперад, два крокі назад»—на 40 мовах 5 мільёнаў 328 тысяч, «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі»—на 49 мовах 5 мільёнаў 725 тысяч, «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм»—на 23 мовах 5 мільёнаў 39 тысяч, «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма»—на 49 мовах 7 мільёнаў 51 тысячу, «Чарговыя задачы Савецкай улады»—на 47 мовах 3 мільёны 510 тысяч, «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме»—на 50 мовах 4 мільёны 773 тысячы экзэмпляраў.**



У. І. Ленін выступае з балкона Массавета з прывітаннем перад байцамі-камуністамі, якія адпраўляюцца на барацьбу з Дзенікіным.

Масква, 16 кастрычніка 1919 года (кінакадр).

(З альбома, які падрыхтаваны да выпуска Інстытутам марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС).

# *Вобраз Леніна ў беларускай паэзіі*

*ЛЕНІН... Незабыўнае, неўміручае імя... Праходзяць эпохі, змяняюцца пакаленні, пераўтвараецца абліччa зямлі, а вобраз Леніна набывае ўсё большую веліч і значэнне. Сваёй барацьбой і творчасцю народы ўслаўляюць вялікага чалавека, які сілаю свайго генія асвятляе шлях чалавецтву да вяршыняў прагрэсу, свабоды, шчасця. У нашу эпоху імя вялікага Леніна і дзейнасць Ленінскай партыі з'яўляюцца сімвалам і ўвасабленнем усяго найбольш перадавога, сумленнага, чалавечнага. У перамогах, дасягненнях і імкненнях нашага народа і народаў свету жывуць і становяцца явай бесмяротныя ідэі Ільіча. Глыбокае пранікненне ленінскай праўды ў свядомасць мас, непарыўная сувязь ленінскага вучэння з гістарычным лёсам народаў свету, няўхільнае захаванне і ажыццяўленне ленінскіх наказаў і запаветаў, — усе гэта абумоўлівае выключны інтарэс перадавога мастацтва і літаратуры свету да вобраза найвялікшага чалавека нашага часу—вобраза У. І. Леніна.*

*Раскрываючы гістарычныя шляхі нашага народа, беларускія савецкія паэты з неаслабнымі намаганнямі імкнуліся і імкнуцца даць у сваіх творах шматгранны вобраз Леніна, паказаць ролю правадыра ў вялікіх бітвах за народнае шчасце і адносіны простага чалавека да ленінскіх ідэй, раскрыць глыбінныя прычыны іх сілы і жыццёвасці. Леніну прысвечаны самыя хвалюючыя і задушэўныя творы беларускай паэзіі. У дарагім і блізкім народу вобразе раскрываюцца вялікі розум правадыра, жалезная воля рэвалюцыянера, вера ў творчыя магчымасці працоўных мас, палымяная нянавісць да ўсялякага рабства і прыгнёту, надзвычайны талент арганізатара і глыбокая чалавечнасць і прастата.*

*АДНЫМ з першых у беларускай паэзіі да вобраза Леніна звярнуўся Паўлюк Трус. Паэт паказвае, што светлыя думкі Леніна сталі думкамі чалавека-працоўнага, яго духоўны свет ажывае пад жыватворным святлом ленінскай праўды.*

*...Сяляне разважаюць аб тым новым, што прыходзіць і прыдзе ў іх жыццё (верш «Аб Леніне»). І кожны з іх перакананы, што вялікі і малы крок да палепшання сялянскага жыцця звязаны з імем Леніна, што ўсё новае і добрае ідзе ад Леніна. Яны вераць у будучыню, бо вераць Леніну.*

*ТАЛЕНАВІТЫ паэт Міхась Чарот стварыў паэму «Ленін», у якой паказаў надзвычайную папулярнасць Леніна сярод шырокіх мас сялянства. ...Ніколі не бачыў радасці беззямельны селянін Мікіта. Праўда аб шчасці стала вядомай яму разам з імем Леніна. І таму Мікіта не можа ўявіць свайго жыцця без Леніна. У марах сваіх, у роздуме аб лепшай долі*

*...Мікіта*
*З Леніным раецца,*
*Пытае не хітра,*
*Як шчасце здабыць...*

*Невычэрпная любоў народа да Леніна раскрыта З. Бядулем у паэме «Чырвона-чорная жалоба». Вобраз Леніна ў паэме — гэта вобраз асілка — моцнага сілаю мас, гэта вобраз Праметэя-барацьбіта і чалавекалюбца, які запаліў ачышчальны агонь рэвалюцыі, прынёс людзям сонца будучыні і шчасця. Сцвярджаючы думку аб бяссмерці ленінскай справы, Бядуля пісаў:*

*Надыйдзе час*
*І ленінізм ахопіць*
*Агнёва-сонечным штандарам*
*СССР сусвету...*

*МНОГІЯ свае творы прысвяцілі Леніну Янка Купала, Якуб Колас, Пятрусь Броўка, і Пятро Глебка.*

*Аб чым бы не пісалі паэты: аб квітнеючай Беларусі, аб дружбе народаў, аб шчасці вольнага чалавека,—усюды паўстае вобраз Леніна, вобраз велічны, гераічны, узвышаны.*

(Працяг на стар. 2)

# Юныя ленінцы ў філолагаў

ВЕЧАР, што адбыўся на філалагічным факультэце, быў некалькі своеасаблівым. Актавую залу запоўнілі выкладчыкі, студэнты і... піянеры. Справа ў тым, што студэнты І-га курса аддзялення рускай мовы і літаратуры шэфствуюць над 54-й школай. І вось аднойчы Соф'я Лібкінд прапанавала:

—Таварышы, а што калі Ленінскі вечар мы правядзем разам з вучнямі, запросім іх да сябе.

Прапанова спадабалася ўсім.

І вось у госці да філолагаў прышлі іх малодшыя сябры.

Вечар пачынаецца з лінейкі. Гарніст іграе «на збор». Важатая прымае рапарт ад старшыні савета атрада.

Выкладчыца Ядвіга Паўлаўна Навуменка расказвае аб гісторыі стварэння універсітэта. У 1921 годзе У. І. Ленін падпісаў указ аб заснаванні ў нашай краіне цэлага шэрагу універсітэтаў, у тым ліку і Беларускага. У знак бязмежнай любві да Уладзіміра Ільіча, у знак падзякі за яго клопаты, наш універсітэт быў названы імем вялікага правадыра.

Потым выступіў загадчык кафедры журналістыкі, член КПСС з 1921 года Марк Саламонавіч Зярніцкі. Марку Саламонавічу давялося два разы, на 3-ім і 4-ым усесаюзных з'ездах прафсаюзаў бачыць і чуць Уладзіміра Ільіча Леніна. Усхвалявана расказаў ён аб гэтых незабыўных днях.

Студэнты ўручаюць піянерам дарагі падарунак—бюст Ільіча.

Потым пачынаецца сумесны канцэрт.

— Урывак з паэмы Уладзіміра Маякоўскага «У. І. Ленін» чытае студэнт першага курса Анатоль Стражэвіч,—аб'яўляе вядучы.

У залі становіцца ціха-ціха. І вось у гэтай цішыні гучаць палымяныя словы паэта. Такія ж блізкія і вечна жывыя, як і той, каму яны прысвечаны.

Ленин и партия —
блиэнецы-братья,
Кто более матери—истории ценен.
Мы говорим Ленин—
подразумеваем партия!
Мы говорим партия
—подразумеваем Ленин!

Анатоля змяняюць вучні. Яны цудоўна выконваюць літаратурны мантаж «Дарога Леніна».

Пасля былі арганізаваны гульні, атракцыёны. Пераможцы атрымалі прызы.

Дзеці горача дзякавалі сваім старэйшым сябрам за цікавы вечар.

**М. ШЫМАНСКІ.**

